Адбылося масавае абеззямельванне і збядненне сялянства ў царкоўных уладаннях. Так, калі ў другой палавіне XVI ст. удзельная вага сялянскіх сем'яў, якія мелі надзел меншы за той мінімум, што забяспечваў простае ўзнаўленне сялянскай гаспадаркі і рэнту землеўласніку, складала толькі 2% ад агульнай лічбы трымальнікаў, то ў канцы вывучаемага перыяду малазямельныя сем'і склалі 61,7%.

Неабходна адзначыць, што ступень забяспечанасці зямлёй сялян у царкоўных уладаннях на працягу другой палавіны XVI—XVIII ст. была значна ніжэйшай, чым у маёнтках свецкіх землеўладальнікаў [18]. Большасць царкоўных сялян Беларусі ў XVII—XVIII стст. трымала мізэрныя надзелы, якія сапраўды «служылі цалкам і выключна для эксплуатацыі селяніна памешчыкам, для «забеспячэння» памешчыку рабочых рук, ніколі для сапраўднага забеспячэння самога селяніна» [19].

*Інстытут гісторыі АН БССР*


## Резюме

Рассматривается землевладение церковных крестьян Белоруссии во второй половине XVI—XVIII в. Впервые на обширном материале исследуются размеры н структура земельного надела крестьян во владениях церковных феодалов, определяется степень обеспеченности крестьянских хозяйств землей.

## Summary

The landownership of church peasants of Byelorussia in the second half of the XVI-XVIIIth centuries is under consideration. For the first time a great deal of material is employed to analyse the dimensions and structure of the land allotment of church peasants, a degree of providing the peasants with land is elucidated.


[18] Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв. С. 22—27, 122—144; Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII—XVIII вв. Минск, 1969. С. 185. Табл. 5.

[19] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 1. С. 516.

*М. М. ЗАБАЎСКІ*

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў СУВЯЗІ З УВЯДЗЕННЕМ ЗЕМСТВА Ў БЕЛАРУСІ

Буржуазныя рэформы 60-х гадоў XIX ст. былі буйнейшымі вехамі пры пераходзе Расіі ад феадальна-прыгоннай фармацыі да капіталізму. Да іх належала і земская рэформа. Па прынятаму 1 студзеня 1864 г. «Палажэнню аб губернскіх і павятовых земскіх установах» былі створаны органы мясцовага самакіравання, якія з'яўляліся адзіным дзяржаўным інстытутам у Расійскай імперыі, што грунтаваўся на выбарным пачатку і ў нейкай ступені дазваляў праявіцца грамадскай самадзейнасці. Земская рэформа, праведзеная ўрадам, была ўступкай буржуазнаму развіццю краіны, але вельмі нязначнай. Правы земстваў былі крайне абмежаваныя. «Земствы,—пісаў У. І. Ленін,—не мелі сваіх выканаўчых органаў, яны павінны былі дзейнічаць праз паліцыю, земствы адразу былі пастаўлены пад кантроль адміністрацыі» [1].

У рабоце «Ганіцелі земства і анібалы лібералізму» У. І. Ленін паказаў, што на ўвядзенне земскіх устаноў урад штурхнула першая рэвалюцыйная сітуацыя ў канцы 50 — пачатку 60-х гадоў, «хваля грамадскага ўзбуджэння і рэвалюцыйнага націску» [2].

Пытанням гісторыі ўвядзення земства ў Заходнім краі прысвечаны

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 5. С. 35.

[2] Там жа. С. 33.

артыкулы А. Я. Аўрэха, В. В. Сарокінай, В. П. Слабажаніна [3]. Пытанняў грамадска-палітычнай барацьбы ў Беларусі, звязанай з увядзеннем земства, даследчыкі па сутнасці не закранаюць.

У аснове выбарчай сістэмы па «Палажэнню аб губернскіх і павятовых земскіх установах» ляжаў выбарны, заснаваны на маёмасным і саслоўным цэнзах пачатак. Выбаршчыкі падзяляліся на курыі: павятовыя землеўладальнікі, гарадскія выбаршчыкі і выбарныя ад сельскіх таварыстваў. Дзве першыя курыі не насілі саслоўнага характару, трэцяя была чыста саслоўнай — сялянскай. Адзначанае Палажэнне забяспечвала перавагу ў земстве памеснага дваранства. З дапамогай земства ўрад спадзяваўся ўзнагародзіць яго за страту ўлады над сялянамі і прыцягнуць на бок самадзяржаўя «вядомую частку ліберальнага грамадства» [4].

Сфера дзейнасці земскіх устаноў была абмежавана выключна мясцовымі, у асноўным гаспадарчымі, справамі (утрыманнем у парадку дарог, будаўніцтвам школ, бальніц і г. д.).

К канцу 70-х гадоў XIX ст. земскія ўстановы былі створаны ў 34 губернях Расіі. На Беларусь, Літву і некаторыя іншыя нацыянальныя раёны палажэнне аб земстве не распаўсюджвалася. У 9 заходніх губернях — Віцебскай, Віленскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай — гэта было выклікана тым, што ў паўстанні 1863 г. актыўны ўдзел прыняло мясцовае, у пераважнай большасці апалячанае дваранства [5]. Пакладзены ў аснову выбарчай сістэмы маёмасна-саслоўны пачатак забяспечваў бы ў земствах гэтых губерняў перавагу польскіх памешчыкаў.

Пасля 1863 г. урад праводзіў палітыку падрыву эканамічнага значэння польскага землеўладання ў Заходнім краі і адначасова ставіў мэту стварэння ў Беларусі і Літве надзейнай сацыяльнай апоры самадзяржаўя ў асобе памешчыкаў рускага паходжання. Але і да канца XIX ст. гэта задача не была вырашана і пытанне аб увядзенні земства заставалася адкрытым.

Палажэнне ад 12 чэрвеня 1890 г. патрабавала ад урада перагляду земскай выбарчай сістэмы ў Расіі. Ліквідаваўся бессаслоўны характар першых двух курый: першая ператваралася ў дваранска-памешчыцкую, другая прадстаўляла гарадскія саслоўі, трэцяя, як і раней,— сялян. Для гарадскіх выбаршчыкаў (буржуазіі) выбарчы цэнз павышаўся да 15 тыс. руб. (раней ён складаў у залежнасці ад колькасці насельніцтва ў горадзе ад 500 да 3000 руб.). У выніку прадстаўніцтва гарадской буржуазіі ў земскіх установах было рэзка абмежавана з мэтай яшчэ большага ўзмацнення ў іх ролі памеснага дваранства. Земская контррэформа 1890 г. яшчэ ў большай ступені не падыходзіла да ўмоў Заходняга краю.

У красавіку 1903 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях былі ўведзены ўстановы адміністрацыйнага тыпу для вядзення земскай гаспадаркі. Яны ствараліся не на выбарных пачатках, а цалкам па прызначэнню адміністрацыі, прычым толькі ў губернях.

Адчуўшы магутныя ўдары першай расійскай рэвалюцыі, царызм ужо не мог кіраваць па-ранейшаму, ён вымушаны быў лавіраваць паміж прыгоннікамі-памешчыкамі і вярхамі гандлёва-прамысловай буржуазіі. У Расіі з'явілася агульнадзяржаўная прадстаўніцкая ўстанова — Дзяр-

---

[3] Аврех А. Я. Вопрос о западном земстве и банкротство Столыпина // Исторические записки АН СССР. М., 1961. Т. 70. С. 61—112; Сорокина В. В. Политика русского самодержавия в отношении западных земств // Правоведение. 1979. № 1. С. 70—76; Слабажанін В. П. Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864—1911 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1983. № 4. С. 73—80.

[4] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 5. С. 66.

[5] У 1865 г. у Гродзенскай, Віленскай, Мінскай і Віцебскай губернях 87,6% усіх землеўладальнікаў мелі польскае паходжанне. Яны валодалі 87,2% маёнткаў і 80,4% уладальніцкай зямлі (Самбук С. М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во II половине XIX в. Минск, 1976, С. 16).

жаўная дума. Разагнаўшы першыя дзве Думы, урад па выбарчаму закону 3 чэрвеня 1907 г. склікаў III Думу, у якой дамінуючае становішча занялі памеснае дваранства і буйная буржуазія. У канцы 1907 г. колькасны састаў фракцый у Думе быў наступным: крайнія правыя — 50 дэпутатаў, умерана-правыя і нацыяналісты — 97, акцябрысты і прымыкаючыя да іх — 154, прагрэсісты — 28, кадэты — 54, мусульманская група — 8, польскае кола — 11, польска-літоўска-беларускае кола — 7, трудавікі — 13, сацыял-дэмакраты — 20 (пазней — 14) дэпутатаў. Ні адна з памешчыцка-буржуазных партый, не гаворачы ўжо аб левых, не мела ў Думе абсалютнай большасці. Большасць залежала ад акцябрыстаў. У выпадку, калі яны галасавалі сумесна з правымі, ствараласяправаакцябрысцкая большасць, пры галасаванні з прагрэсістамі і кадэтамі — акцябрысцка-кадэцкая. Абедзве большасці займалі контррэвалюцыйныя пазіцыі.

Адным з галоўных сродкаў барацьбы з рэвалюцыйным рухам царызм выбраў у той час адкрыта шавіністычную палітыку — траўлю «іншародцаў» і «іншаверцаў», у заходніх губернях — палякаў, католікаў і яўрэяў. За падобную палітыку выступалі чарнасоценныя з'езды памешчыкаў, правая прэса, якія патрабавалі ўзмацнення барацьбы з «сепаратызмам» у Заходнім краі. Яны выстаўлялі ідэю аб стварэнні ў заходніх губернях земстваў, якія выбіраліся «нацыянальнымі» курыямі, пры ўмове забеспячэння перавагі «рускай» курыі. Першым крокам у гэтым напрамку стаў унесены чарнасоценцамі ў Дзяржаўны савет у 1909 г. праект, які прадугледжваў змяненне парадку выбараў у савет ад заходніх губерняў. З-за адсутнасці земскіх устаноў выбары тут праводзіліся дваранскімі сходамі, дзе колькасна пераважалі польскія землеўладальнікі, што ўплывала на вынікі выбараў. Чарнасоценцы патрабавалі, каб дзевяць месц у Дзяржаўным савеце занялі рускія, а не польскія памешчыкі. Увядзенне земства на падставе нацыянальных курый па іх рэкамендацыях дазваляла пакончыць з манаполіяй польскага прадстаўніцтва ў Дзяржаўным савеце ад Заходняга краю.

Праект быў адобраны старшынёй Савета міністраў П. А. Сталыпіным, і ўрад прыступіў да распрацоўкі законапраекта аб заходніх земствах. Афіцыйная назва праекта — «Аб выкарыстанні Палажэння аб земскіх установах 12 чэрвеня 1890 года да губерняў Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай». Законапраект грунтаваўся на Палажэнні 1890 г., але ў яго, у адпаведнасці з нацыяналістычнымі планамі П. А. Сталыпіна, быў унесены рад істотных змяненняў. Замест саслоўных курый (сялянскай і памешчыцкай) уводзіліся курыі нацыянальныя — «руская» і «польская». У «рускую» курыю ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва, а ў «польскую» — каталіцкае. Царызм, такім чынам, афіцыйна пацвердзіў сваё адмаўленне факта існавання беларускай нацыі.

Для таго каб забяспечыць перавагу ў земстве за рускімі памешчыкамі, быў прыдуманы штучны прынцып размеркавання колькасці гласных па курыях. Бралася сярэдняе арыфметычнае колькасці «рускага» і «польскага» насельніцтва і кошт іх нерухомай маёмасці (у працэнтах). Атрыманая лічба і складала гранічную колькасць гласных, якія выбіраліся курыяй [6]. Далучаючы да «рускай» курыі праваслаўных беларускіх сялян, улады забяспечвалі ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях яе большасць на выбарах. У сувязі з тым што ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але ў значнай

[6] Напрыклад, калі польскае насельніцтва ў дадзенай мясцовасці складала 2%, а польская нерухомасць — 38% вартасці ўсёй нерухомай маёмасці, то пасля складання і дзялення на 2 атрымлівалася 20 (г. зн. працэнт колькасці гласных польскага насельніцтва ў дадзеным земскім сходзе) (Государственная дума. Третий созыв: Стеногр. отчеты. Сессия III. Ч. IV. СПб., 1910. Стб. 738).

ступені і сялянства былі каталіцкімі [7], то і па такой сістэме падлікаў перавагу мела б «польская» курыя. У сувязі з гэтым увядзенне земства ў гэтых губернях не меркавалася.

Класавы, прапамешчыцкі характар праекта ярка адлюстроўваўся ў тым, што ў павятовыя земскія сходы сяляне маглі пасылаць не больш за трэць усіх гласных, а ў губернскія земствы сялянскія прадстаўнікі наогул не дапускаліся.

Законапраект аб заходнім земстве быў разлічаны на зближэнне заможнай праслойкі беларускіх і ўкраінскіх сялян з рускімі памешчыкамі на платформе рускага нацыяналізму і аслаблення ўплыву польскіх памешчыкаў у краі.

У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. беларускае праваслаўнае кулацтва актыўна падтрымлівала рускія шавіністычныя партыі акцябрыстаў і чарнасоценцаў. На такіх пазіцыях стаяла, у прыватнасці, таварыства «Селянін», утворанае ў Вільна С. Кавалюком. Яно выдавала часопіс пад той жа назвай. Пазней з таварыства «Селянін» вылучылася «Беларускае таварыства» на чале з Л. Саланевічам. Яно выдавала газету пад назвай «Беларускае жыццё», пазней «Паўночна-Заходняе жыццё». Чарнасоценнае беларускае кулацтва актыўна падтрымлівала вялікадзяржаўны шавіністычны курс урада, разлічваючы на тое, што ён дазволіць яму пранікнуць у органы мясцовай улады і пажывіцца за кошт польскіх памешчыкаў.

Салідарызуючыся з урадам і рускімі нацыяналістамі, адзначаныя арганізацыі адмаўлялі існаванне беларускай нацыі, нацыянальнай мовы і культуры. «Беларускае жыццё» сцвярджала, што «беларускае племя — складаючая і непадзельная частка рускага народа, а народ гэты жыве адным жыццём» [8]. На гэтай падставе былі пабудаваны і адносіны да земства. Часопіс «Селянін» пісаў: «У інтарэсах дзяржавы і карэннага насельніцтва земства ў краі павінна быць не іншародніцкім, а рускім»[9]. Такую ж пазіцыю займала і «Беларускае жыццё». «Урад,— пісала яна,— павінен пабудаваць сістэму земскіх выбараў у краі на больш шырокіх пачатках, з прыцягненнем рускага элемента. Няхай тады земствы будуць недастаткова культурнымі ці нават зусім некультурнымі, але яны будуць рускімі» [10].

Спрабуючы згладзіць вострыя класавыя антаганізмы ў Беларусі, Кавалюк і Саланевіч выступалі за аб'яднанне ўсяго «рускага» (беларускага) праваслаўнага насельніцтва краю з рускімі памешчыкамі на платформе велікарускага нацыяналізму для барацьбы супраць «польскага засілля». «У беларускага селяніна,— адзначала «Беларускае жыццё»,— няма класавай варожасці (да рускіх памешчыкаў.— *Н. З.*), і натуральна, што з яго боку не будзе перашкод для такога аб'яднання» [11]. Рэакцыйны друк імкнуўся ачарніць беларускіх сялян, паказаць іх няздольнымі да самастойнай палітычнай і культурнай дзейнасці. У «Паўночна-Заходнім жыцці» адзначалася, што просты народ краю занадта маласвядомы, каб выступаць самастойна. «Стаць на чале народных мас,— пісала газета,— прамы абавязак мясцовага рускага дваранства» [12].

Разам з тым урад не адмаўляўся і ад апоры на польскіх землеўладальнікаў, забяспечваючы ім даволі высокае прадстаўніцтва ў земствах, а ў «польскай» курыі — поўную перавагу над сялянамі.

Для таго каб забяспечыць правядзенне сваіх нацыяналістычных праектаў праз Дзяржаўную думу, П. А. Сталыпін стварыў у ёй фрак-

---

[7] У некаторых паветах Віленскай губерні праваслаўных было толькі 1—2% ад усяго насельніцтва.

[8] Белорусская жизнь. 1909. 9 лют.

[9] Крестьянин. 1910. № 16.

[10] Белорусская жизнь. 1909. 9 лют.

[11] Там жа. 1911. 19 сак.

[12] Северо-Западная жизнь. 1911. 28 кастр.

цыю рускіх нацыяналістаў, у якую ўвайшлі ў асноўным чарнасоценцы. Іх лідэрам стаў буйны памешчык, яры шавініст граф А. А. Бобрынскі. Законапраект аб заходнім земстве быў першым сумесным выступленнем П. А. Сталыпіна з нацыяналістамі як новай урадавай партыяй.

Увядзенне мясцовага самакіравання ў Заходнім краі было састаўной часткай сталыпінскай аграрнай рэформы. І таму не столькі абарона інтарэсаў «рускага» насельніцтва краю, як гэта можа паказацца на першы погляд, хвалявала прэм'ер-міністра, колькі магчымасць вывесці на палітычную арэну сапраўды «рускае» праваслаўнае кулацтва. Выступаючы ў Дзяржаўным савеце, ён адзначаў, што «эканамічнае адраджэнне мы будуем на наяўнасці пакупной здольнасці моцнага заможнага класа на нізах, ... на наяўнасці гэтага элемента трымаюцца і нашы законапраекты аб паляпшэнні мясцовага земскага жыцця» [13]. Але Сталыпін у той момант не раскрыў сваёй задумы, бо баяўся апазіцыі з боку буйных польскіх дваран-землеўладальнікаў, прадстаўнікі якіх засядалі і ў Дзяржаўным савеце і ў думскіх камісіях.

На папярэднім абмеркаванні ў думскай камісіі па мясцоваму самакіраванню ішлі дэбаты вакол нацыянальных курый. Акцябрысты, зыходзячы з інтарэсаў памешчыкаў, прапанавалі вызначаць колькасць гласных зыходзячы толькі з аднаго паказчыка — працэнта вартасці нерухомых маёмасцей у паветах. Паколькі дзякуючы гэтаму ў некаторых паветах Беларусі прадстаўніцтва польскіх памешчыкаў склала б больш за 50%, камісія спынілася на пагубернскіх адносінах нерухомых маёмасцей, якія забяспечвалі перавагу «рускай» курыі. У Мінскай губерні, згодна з гэтай нормай, колькасць гласных ад «польскай» курыі склала 29, а ў Магілёўскай — 13% [14]. І тым не менш гэта папраўка крыху павялічыла прадстаўніцтва гласных ад «польскай» курыі. Камісіяй было прынята рашэнне зменшыць напалавіну выбарчы земскі цэнз — з 15 тыс. да 7,5 тыс. руб. На гэтым настойваў і П. А. Сталыпін. «Змяншэнне цэнзу,— лічыў ён,— павядзе да згуртавання масы сярэднезаможных, але культурных рускіх уласнікаў» [15]. Беларускі праваслаўны кулак прыцягваўся, такім чынам, да саюзу з рускім памешчыкам.

У III Дзяржаўную думу ад заходніх губерняў былі выбраны 36 дэпутатаў, у тым ліку 12 памешчыкаў, 8 прадстаўнікоў духавенства, 5 чыноўнікаў, 11 сялян. У Думе яны размеркаваліся па наступных фракцыях: правыя — 16 дэпутатаў, нацыяналісты — 9, акцябрысты — 4, прагрэсісты — 1, 6 дэпутатаў утварылі польска-літоўска-беларускае кола [16]. Апошняе склалі прадстаўнікі ад польскіх памешчыкаў і каталіцкага духавенства Заходняга краю. У кола ўваходзіў і адзін селянін-католік.

У спрэчках па пытанню аб увядзенні земства выявіліся некаторыя разыходжанні паміж чарнасоценцамі і нацыяналістамі ад Заходняга краю. Павятовы лідэр дваранства з Магілёўскай губерні Н. Н. Ладамірскі заявіў, што калі будзе прынята папраўка камісіі па мясцоваму самакіраванню, якая павялічвае колькасць гласных ад «польскай» курыі, то земствы Паўночна-Заходняга краю «ператворацца ў чыста польскую арганізацыю і стануць магутнай зброяй для паланізацыі краю» [17]. Вялікую небяспеку ўплыву палякаў на Заходні край у выпадку прыняцця дадзенай папраўкі бачыў і рэктар духоўнай семінарыі, дэпутат ад Мінскай губерні А. Д. Юрашкевіч. Але абодва яны выступалі за ўвядзенне земства, бачачы ў ім сродак і эканамічнага пад'ёму, і ўзмацнення «рускай дзяржаўнасці» ў заходніх губернях. Г. Г. Замыслоўскі, дэпутат ад Віленскай губерні, яры манархіст, якому інтарэсы Заходняга краю былі

---

[13] Государственный Совет: Стеногр. отчеты, 1909—1910. Сессия V. СПб., 1910. Стб. 1143.

[14] Государственная дума. Сессия III. Ч. IV. Стб. 743.

[15] Столыпин П. А. Сборник речей. Спб., 1911. С. 49.

[16] Боиович М. М. Члены Государственной думы (Портреты и биографии). Третий созыв 1907—1912. М., 1910. С. 16—28, 73—79, 164—179.

[17] Государственная дума. Сессия III. Ч. IV. Стб. 871.

абыякавыя, спрабаваў даказаць, што ў заходніх губернях наогул нельга ўвесці ніякага земства. «Я не ўяўляю,— гаварыў ён,— як можна ўводзіць земствы ў такой мясцовасці, дзе існуе некалькі нацыянальнасцей,— варожых адна адной, прычым ні адна не мае абсалютнай большасці» [18]. На яго думку, царскія чыноўнікі не горш за прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва маглі кіраваць у краі.

Актыўны ўдзел у думскіх дэбатах прымалі прадстаўнікі праваслаўнага духавенства Беларусі, якія прымыкалі да чарнасоценных груп. Чарнасоценцы і нацыяналісты дабіваліся больш шырокага прадстаўніцтва духавенства ў заходнім земстве. Лідэр думскіх нацыяналістаў А. А. Бобрынскі заявіў, што «духавенства зможа ў земстве аб'яднаць, згуртаваць сялянства з землеўладальнікамі і дваранствам» [19]. Чарнасоценца Г. Г. Замыслоўскага хвалявала тое, што калі будзе прыняты праект урада, земства на захадзе будзе мець моцнае дэмакратычнае адценне. Сваю заяву ён абгрунтаваў тым, што рускіх памешчыкаў там амаль няма, а сяляне ўяўляюць сабой вялікую сілу. І каб іх згуртаваць, арганізаваць, неабходна прысутнасць духавенства на земскіх сходах. Падобная пазіцыя адлюстроўвала страх чарнасоценцаў і нацыяналістаў перад сялянствам, спробы ўмацаваць духавенства як процівагу даволі значнаму сялянскаму прадстаўніцтву.

Папраўкі, унесеныя камісіяй па мясцоваму самакіраванню ў законапраект, паслужылі прычынай абвастрэння рознагалоссяў у «Саюзе 17 кастрычніка». Галоўнай з іх з'явілася папраўка, якая вызначала колькасць гласных ад кожнай курыі. Меншасць акцябрыстаў, выступаючы ў падтрымку Сталыпіна, была за вызначэнне колькасці гласных па дзвюх прыкметах: па цэнзу і колькасці насельніцтва. Большасць акцябрыстаў зыходзіла толькі з аднаго паказчыка — працэнта вартасці нерухомай маёмасці. Апошнія тлумачылі сваю пазіцыю тым, што павелічэнне ў земстве колькасці «палякаў» будзе вельмі нязначным. Да гэтай групы прымыкаў і адзін з нямногіх прадстаўнікоў «Саюза 17 кастрычніка» ад Заходняга краю, дэпутат ад Віцебскай губерні, міравы суддзя А. П. Сапуноў. У прамове, выказанай у Дзяржаўнай думе 11 мая 1910 г., ён заявіў: «Мы не супраць удзелу палякаў у нашым земстве, мы толькі супраць перабольшвання як сілы, так і аб'ёму іх удзелу» [20]. Гэта частка акцябрыстаў баялася пасля вопыту рэвалюцыі 1905—1907 гг. напаўнення земства «рускімі» элементамі з ліку сялян за кошт польскіх памешчыкаў. Яна лічыла неабходным аб'яднанне на класавай аснове з польскімі памешчыкамі, якія ў цэлым займалі контррэвалюцыйныя пазіцыі.

Гэта пацвярджалі і самі польскія памешчыкі, і прадстаўнікі каталіцкага духавенства, якія ўваходзілі ў польска-літоўска-беларускую групу,— С. А. Ваньковіч, В. К. Есьман, К. А. Завіша, С. Г. Мацяевіч, І. С. Монтвіл, Г. І. Свянціцкі. У сваіх выступленнях яны выказалі гатоўнасць верай і праўдай служыць рускаму самадзяржаўю. «Мы, палякі, па нашых перакананнях,— гаварыў віленскі памешчык С. А. Ваньковіч,— манархісты і канстытуцыяналісты, у нас вы заўсёды знойдзеце прыхільнікаў права і законнасці» [21]. Група выказалася ў абарону ўвядзення земства па Палажэнню 12 чэрвеня 1890 г., без нацыянальных курый. Паколькі гэта Палажэнне забяспечвала перавагу памешчыкаў над сялянамі, то ў земствах заходніх губерняў пануючае становішча занялі б польскія памешчыкі. Роля прыгнятальнікаў у адносінах да беларускага сялянства іх цалкам задавальняла. А роля прыгнечанай, урэзанай па новаму законапраекту ў палітычных правах нацыі ўспрымалася хваравіта. Той жа С. А. Ваньковіч заклікаў да прызнання палякаў

[18] Государственная дума. Сессия III. Ч. I. Стб. 182.
[19] Там жа. Ч. I. Стб. 1677.
[20] Там жа. Ч. IV. Стб. 1140.
[21] Там жа. Стб. 1130.

раўнапраўнымі грамадзянамі Расійскай імперыі. «Калі б гэта адбылося,— адзначаў ён,— то іншародцы не горш за вас абаранялі б сілу і магутнасць рускай дзяржавы, не адмаўляючыся ні ад сваёй веры, ні ад сваёй нацыянальнасці» [22]. Такім чынам, польска-літоўска-беларускае кола выказвала інтарэсы выключна польскіх памешчыкаў.

Рэзка адмоўна ўспрынялі законапраект кадэты. Яны лічылі, што ўвядзенне нацыянальных курый — паказчык грубейшай нацыяналістычнай палітыкі царызму, якая аслабляе дзяржаву на заходніх ускраінах. Адзін з лідэраў партыі — М. В. Родзічаў, звяртаючыся да прыхільнікаў праекта, заявіў: «Гэты праект ёсць вялікі ўдар адзінству Расіі; гэта — клін, які вы ўгоніце, можа, у яе сэрца...» [23] Праўда, адхіляючы яго, яны тым не менш выказалі надзею на «аб'яднанне» ўрада з грамадствам, але на падставе Маніфеста 17 кастрычніка.

Пазіцыя правых думскіх сялян-дэпутатаў ад заходніх губерняў заслугоўвае асаблівай увагі. Усе яны выступалі за ўвядзенне земства, але пратэставалі супраць яго антысялянскага характару, патрабуючы павелічэння сялянскага прадстаўніцтва. Уладальнік 30 дзесяцін зямлі, дэпутат ад Мінскай губерні А. Ф. Кучынскі прасіў прыняць праект з некаторымі змяненнямі, напрыклад, з паніжэннем цэнзу. Ён прапаноўваў: «З прычыны таго, што сялян большасць і на іх абапіраецца ўсё, то сялян павінна быць у земстве палавіна ці ў крайнім выпадку адна трэцяя частка» [24]. Найбольш характэрнай для правых сялян была прамова дэпутата ад Віцебскай губерні В. Г. Амасёнка. Ён патрабаваў павелічэння колькасці сялян «у палавіннай колькасці, як ім гэта і трэба, і на гэта яны маюць права па іх колькасці». У той жа час ён заявіў, што «будзе галасаваць па перакананню свайго сумлення, як заклікаць па волі любімага манарха...» [25]

Пазіцыя В. Г. Амасёнка спалучае ў сабе і пратэст супраць нераўнапраўя сялян і веру ў манарха. Іменна пра такіх сялян У. І. Ленін пісаў: «На словах адданы старой уладзе, але на справе змагаецца з памешчыкамі...» [26] Гэта характарыстыка датычыцца большасці правых сялян у III Думе.

Трудавікі лічылі, што мясцовае самакіраванне павінна быць пабудавана «на роўным удзеле ў ім усяго мясцовага насельніцтва, без адрознення полу, рэлігіі і нацыянальнасці». Урадавы законапраект, на іх думку, не адказваў гэтаму патрабаванню. У рэзалюцыі трудавікоў адзначалася, што праект «прасякнуты духам нацыянальнай і рэлігійнай нецярпімасці», што ў інтарэсах невялікай кучкі рускіх памешчыкаў у ахвяру прыносіцца «рускае, маларускае, беларускае працоўнае сялянства і рабочае насельніцтва», што ён адцягвае «ўвагу насельніцтва ад карэнных пытанняў дзяржаўнага жыцця, аслабляючы яго барацьбу з агульнай сістэмай урадавага дэспатызму і прыгнёту» [27]. Зыходзячы з гэтага, трудавікі адхілілі законапраект.

Сацыял-дэмакратычная фракцыя пры абмеркаванні праекта аб заходнім земстве рэзка асудзіла шавіністычную палітыку царызму і правых партый. Найбольш яскрава гэта адлюстравалася ў выступленні прымыкаўшага да бальшавікоў дэпутата І. П. Пакроўскага. Звяртаючыся да правых дэпутатаў Думы, ён заявіў: «Вы бяссільныя... у сэнсе арганізацыі дзяржаўных сіл. І вы ў бяссільнай злосці травіце ўскраіны, травіце іншародцаў, травіце ўсялякую самадзейнасць у рускім народзе» [28]. І. П. Пакроўскі выкрываў не толькі рускіх, але і польскіх па-

---

[22] Государственная дума. Сессия III. Ч. IV. Стб. 1129—1130.
[23] Там жа. Стб. 1117.
[24] Там жа. Стб. 1021.
[25] Там жа. Стб. 2789.
[26] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 16. С. 362.
[27] Государственная дума. Сессия III. Ч. IV. Стб. 1229.
[28] Там жа. Стб. 1106.

мешчыкаў. «Польскае дваранства, — заявіў ён,— як і рускае, з'яўляецца тыповым праціўнікам дэмакратыі» [29].

Законапраект Сталыпіна быў прыняты Думай з нязначнымі папраўкамі. Але Дзяржаўны савет 4 сакавіка 1911 г. 92 галасамі супраць 68 адхіліў падзел выбаршчыкаў на нацыянальныя курыі. Фактычна ж большасць членаў Савета выступілі супраць паніжэння цэнзу, г. зн. павышэння ўдзельнай вагі кулацтва ў земствах заходніх губерняў. Буйныя землеўладальнікі-арыстакраты не жадалі дзяліць уладу ў земстве з «моцнымі мужычкамі» і правалілі законапраект.

П. А. Сталыпін быў вымушаны падаць у адстаўку. Але Мікалай II адхіліў яе і даў згоду ўраду на роспуск Дзяржаўнага савета і Дзяржаўнай думы на тры дні з тым, каб правесці законапраект аб заходнім земстве на падставе 87-га артыкула Асноўных законаў, што і было зроблена. Прыняцце закона насуперак большасці Дзяржаўнага савета па надзвычайнаму артыкулу азнаменавала крызіс трэцечэрвеньскай сістэмы і рэзкае аслабленне ўплыву Сталыпіна.

Прыняты закон аб земствах у шасці заходніх губернях меў рэакцыйны характар. Гэта адзначалася ў бальшавіцкай газеце «Звезда», іншых органах дэмакратычнага друку. «Звезда» падкрэслівала, што закон забяспечвае поўнае панаванне ў краі буйных землеўладальнікаў і рускага чыноўніцтва, што ўжо наперад устаноўлена законам колькасць прадстаўнікоў, якія выбіраюцца ад розных слаёў насельніцтва, што сяляне не могуць атрымаць пры выбарах месц больш за ўстаноўленую колькасць. «Такім чынам,— рэзюміравала «Звезда»,— новы закон стварае выгаднае становішча для багатых класаў наогул і для рэакцыйных элементаў рускага насельніцтва ў прыватнасці» [30].

Супраць закона аб земствах выступала і газета «Наша ніва». Яна пратэставала супраць увядзення нацыянальных курый, паколькі новы выбарчы закон, зусім не лічачыся з фактам існавання беларускай нацыі, адносіў праваслаўных беларусаў да «рускай», а католікаў — да «польскай» курыі. Газета падвяргала крытыцы шавіністычную дзейнасць рускіх і польскіх памешчыцкіх арганізацый, а таксама мясцовай адміністрацыі [31]. Аднак, выступаючы супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму і шавінізму польскіх памешчыцка-клерыкальных колаў, «Наша ніва» прапагандавала нацыяналістычныя ідэі бяскласавасці беларускай нацыі [32].

Грамадска-палітычная барацьба ў сувязі са стварэннем земскіх устаноў у заходніх губернях паказала слабасць беларускай нацыянальнай буржуазіі, прадстаўленай у асноўным кулацтвам. Праваслаўнае беларускае кулацтва вывела на палітычную арэну акцябрысцка-чарнасоценныя арганізацыі — таварыства «Селянін», «Беларускае таварыства» і такіх жа дэпутатаў у III Дзяржаўную думу. Адчуваючы сваю слабасць, яны арыентаваліся на саюз з рускім памесным дваранствам на платформе вялікадзяржаўнага шавінізму і спадзяваліся на задавальненне сваіх класавых інтарэсаў з дапамогай царскага ўрада за кошт польскіх памешчыкаў. Значная частка каталіцкага беларускага кулацтва ішла за польскімі памешчыкамі і ксяндзамі — польска-літоўска-беларускім колам у III Думе. Абедзве групы вялі міжусобную барацьбу за палітычнае панаванне ў Беларусі. Супраць шавіністычнай палітыкі царызму і адзначаных груповак актыўна змагаліся дэмакратычныя сілы на чале з бальшавіцкай партыяй.

*Інстытут гісторыі АН БССР*

---

[29] Государственная дума. Сессия III. Ч. IV. Стб. 1101.
[30] Звезда. 1911. 22 (9) крас.
[31] Наша ніва. 1911. 27 (9) снеж.; 1912. 9 лют.; 5 (18) ліп.
[32] БелСЭ. 1973. Т. 7. С. 462.

## Резюме

Раскрывается общественно-политическая борьба в связи с введением земских учреждений в западных губерниях. Показана шовинистическая сущность политики царизма и поддерживавщих ее реакционных организаций «Крестьянин», «Белорусское общество», депутатов III Государственной думы, выражавших интересы русских помещиков, белорусского православного кулачества, духовенства и местного чиновничества.

## Summary

Social and political struggle is shown in connection with foundation of the Zémstvo establishments in the West provinces of Russia. The chauvinist essence of the tsarism policy and such supporting reactionary organizations as «Krestiyanin», «Belorusskoe Obshchestvo» and that of the deputies of the 3rd State Duma representing the interests of the Russian landowners, Byelorussian orthodox clergy and the native officials is revealed.